працы М. Пашкевіча, яе падзвіжніцкі характар дастасоўваюцца да праблематыкі быкаўскага твора. Нагодай жа для прысвячэння паслужыла тая акалічнасць, што М. Пашкевіч быў гарачым прапагандыстам роднай літаратуры, арганізоўваў сустрэчы сваіх выхаванцаў з беларускімі пісьменнікамі, якія часта прыязджалі ў Сваткаўскую школу, перапісваўся выдатнымі майстрамі мастацкага слова. В. Быкаў таксама наведваў Сваткі па запрашэнні Пашкевіча і прысвячэннем "выказаў глыбокую павагу да настаўнікаў-энтузіястаў, апантэнных нялёгкай педагагічнай працай, а яшчэ засведчыў, што і ў пасляваенным жыцці ён ведаў самаадданых педагогаў, блізкіх ягоным Марозу і Міклашэвічу калі не дэталямі біяграфіі, дык унутрана, духоўна" [3, с.156].

Літаратура

1. Бугаёў, Д. Васіль Быкаў : нарыс жыцця і творчасці / Д. Бугаёў. – Мінск : Нар. асвета, 1987. – 207 с.
2. Будны, С. Усім дабраверным хрысціянам мовы рускай прадмова да Катэхізіса / С. Будны // Літаратура XI–XVII стагоддзяў / уклад. і камент. А.У. Бразгунова, І.У. Будзько, Л.В. Пяўкун ; прадм. У.В. Гніламёдава ; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. – Мінск, 2011. – Т. 1. – С. 181–185.

Рэцэпцыя экзістэнцыялізму ў творах Е. Анджэеўскага і В. Быкава

А.А. Любчанка, *магістрант, БДПУ*
Навуковы кіраўнік – ***Н.В. Заяц,*** *канд. філ. навук, дац.*

Экзістэнцыялізм з'яўляецца адным з вядучых філасофскіх напрамкаў сярэдзіны XX стагоддзя. Заходнееўрапейскія мысліцелі Ж.-П. Сартр, К. Ясперс, М. Хайдэгер і інш. прапаноўвалі свае канцэпцыі, якія склаліся ў філасофію экзістэнцыялізму.

Важная катэгорыя экзістэнцыялізму – свабода: кожны чалавек з'яўляецца "праектам", які закінуты ў гэты свет і павінен зрабіць свабодны выбар. Аднак чалавек існуе настолькі, наколькі сябе ажыццяўляе, наколькі яго дзеянні супадаюць з думкамі ці планамі. Толькі рэальныя ўчынкі выяўляюць сутнасць пэўнага чалавека – нездарма экзістэнцыялізм называюць філасофіяй дзеяння. У кожным дзеянні

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

экзістэнцыялізм прадугледжвае пэўную чалавечую суб'ектыўнасць. Гэтая суб'ектыўнасць найбольш яскрава праяўляецца ў памежных сітуацыях.

Магчымасць зразумець і спазнаць сябе ў памежнай сітуацыі Другой сусветнай вайны прадстаўлена героям твораў Е. Анджэеўскага і В. Быкава. Так, падзеі аповесці польскага празаіка "Вялікі тыдзень" адбываюцца напярэдадні Варшаўскага паўстання 1944 года. Насельнікі варшаўскага гета змагаліся з акупантамі, не разлічваючы на поспех. Гэтае супраціўленне і, адпаведна, эмацыйнае напружанне па меры развіцця дзеяння ў творы толькі растуць. Вязні гета паказваюцца ў безвыходнай, тупіковай сітуацыі: з іх здзекваюцца не толькі фашысты, але і многія палякі.

У цэнтры аповесці – маладая яўрэйка Ірэна Лільен. Яе бацька, выдатны вучоны, заўсёды нібы намагаўся даказаць, што аб'ектыўны свет з'яўляецца другасным у адносінах да суб'ектыўных уяўленняў пра жыццё і яго сэнс. Ён вельмі доўга не верыў у рэальнасць, працягваў знешне нармальнае жыццё. Першая экзістэнцыяльная сцэна звязана менавіта з бацькам гераіні: знямоглы ад пакутаў і ад неабходнасці пастаянна хавацца, ён далучыўся да групы змагароў. Гэта быў стыхійны выбар, які, аднак, паўплываў на жыццёс і лёс сям'і – Ірэна з маці засталіся ўдваіх. А праз некаторы час маладая жанчына змагалася ўжо адна, без сяброў, без уладнага жылля, захаваўшы толькі лютую нянавісць да фашыстаў і недавер да ўсіх людзей увогуле. Гэты недавер яна адчула і пры сустрэчы з Янам, якога некалькі кахала. Паляк Ян адчувае сваю адказнасць за ўсе выпрабаванні, што з маўклівай згоды яго суайчыннікаў перажывае яўрэйскі народ, і прапаноўвае Ірэне схавацца ў яго. Такі выбар падтрымлівае і яго цяжарная жонка Аня, якая па рэлігійнаму самааддана далучаецца да гэтай справы. Выбар Яна не быў адназначны: ён доўга сумняваецца ў правільнасці сваіх рашэнняў і дзеянняў, не можа знайсці надзейных крытэрыяў іх ацэнкі, часта шукае апраўдання сваім пачуццям.

Ян неаднойчы перажывае сітуацыю выбару: ён гатовы сур'ёзна размаўляць з суседкай, якая ўбачыла Ірэну і расказала пра яе уладальніку дома. Выбар робіць і гэты персанаж: выдаць Ірэну ці прамаўчаць, даць ёй шанц перамяніць схованку. Тым не менш уладальнік дома, які і сам аказаўся яўрэем, дазволіў пакінуць Ірэну ў кватэры. Выбар у неверагодна складанай сітуацыі быў зроблены. І зноў рызыка, і зноў пагроза для жыцця. Е. Анджэеўскі паказвае, што чалавек застаецца чалавекам, пакуль не пакідае змагацца за жыццё,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нават калі няма шанцаў перамагчы. Адным з такіх змагароў выступае брат Яна Юлек, які рызыкуючы ўласным жыццём дапамагаў яўрэям біцца з немцамі.

Іншую пазіцыю, пазіцыю большасці, прадстаўляюць суседзі Пётраўскія. Яны лічаць яўрэяў прычынай усіх няшчасцяў, думаюць, што рызыкаваць з-за іх жыццём не па-хрысціянску. Аднак гэта іх выбар. Е. Анджэеўскі прадугледжвае магчымасць розных выбараў і не мае намеру асуджаць герояў. Урэшце жыхары дома на чале з Пётраўскай выганяюць Ірэну – гераіня сыходзіць ў невядомасць. Адкрыты фінал твора заклікае чытача да дыялогу, прымушае задумацца над магчымымі ўласнымі паводзінамі ў падобных абставінах.

У аповесці В. Быкава "Сотнікаў" праблема экзістэнцыі выходзіць на першы план. Можна гаварыць праю філасофію Сотнікава, з якой вынікае, што жыццё – галоўная каштоўнасць для грамадства ў цэлым; сіла і гармонія кожнага вызначаецца шчасцем усіх яго членаў; смерці нельга пазбегнуць, але трэба даць чалавеку па сапраўднаму жыць. І калі нават магчымасці цела абмежаваны, гэта нішто не абмяжоўвае сілу духа і веры чалавека. Гэта цалкам сугучна з экзістэнцыяльнымі поглядамі на быццё. Сотнікаў увасабляе ў сабе канцэпцыю экзістэнцыялізму і ўсімі сваімі ўчынкамі адказвае на пытанне: "Што такое чалавек перад знішчальнаю сілай бесчалавечных абставін? На што ён здольны, калі магчымасці абараніць жыццё вычарпаны ім да канца і прадухіліць смерць немагчыма?" [1].

Зусім іншая пазіцыя ў Рыбака. Калі Сотнікаў не адступаў ад сваіх поглядаў, то Рыбак вельмі часта хістаўся ў прыняцці рашэнняў. Ён не бачыць галоўнай каштоўнасці ў людзях, для яго сэнс барацьбы ў тым, каб адстаяць сваё жыццё, і гэтаму ён знаходзіць шматлікія апраўданні. Сапраўдны Рыбак, які паўстаў перад сабой у памежнай сітуацыі, аказаўся зусім не героем. Два персанажы, Сотнікаў і Рыбак, кожны па-свойму зрабілі сябе, кожны з іх абраў свой вобраз чалавека. Сотнікаў – таго, для каго прыярытэтны абавязак у адносінах да іншых, Рыбак – таго, што заклапочаны толькі ўласным жыццём.

Такім чынам, на канкрэтным матэрыяле польскі і беларускі пісьменнікі па-свойму разглядаюць ключавыя для філасофіі экзістэнцыялізму праблемы: выбару, свабоды, адказнасці, сумлення, ахвярнасці і інш. Абодва аўтары даследуюць складаны ўнутраны свет чалавека, зрухі яго душы, матывы, якімі ён кіруецца ў трагічных умовах, пацвярджаючы вядомы тэзіс Ж.-П. Сартра "Экзістэнцыялізм – гэта гуманізм".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура

1. Быкаў, В. Як была напісана аповесць “Сотнікаў” / В. Быкаў // Поўны збор твораў : у 14 т. Т. 10 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://coollib.com/b/318761/read. – Дата доступу : 11.03.2016.

Особенности перевода идиоматических выражений с итальянского языка на русский (на примере идиом с наименованиями частей тела)

М.С. Плещечко, *V курс, БГПУ*
Научный руководитель – ***А.В. Сорокина,*** *преподаватель*

В итальянском языке, как и во многих других языках, используется большое количество идиом. Идиома – оборот речи, значение которого не определяется значениями входящих в него слов. Основным признаком идиомы является ее семантическая неделимость.

Трудность перевода идиоматических выражений заключается в том, что фразеологическому составу каждого языка присущи специфические особенности, поэтому в большинстве случаев невозможно подобрать для них равноценные соответствия во фразеологии других языков. Также часто перевод идиом представляет много трудностей для тех людей, которые с ними не знакомы, поэтому идиоматические выражения часто переводят описательным способом, теряя при этом яркость, образность, стилистическую окраску. Еще одна трудность заключается в распознании идиоматического выражения в тексте. Так идиома *“avere la puzza sotto il naso”* дословно на русский язык переводится как «иметь запах под носом», но ее реальное значение – «задрать нос, быть чем-то недовольным (о снобе)». Таким образом, если при переводе не увидеть в тексте идиому, будет искажен смысл высказывания.

С. Влахов и С. Флорин отмечают, что возможность достижения полноценного словарного перевода фразеологической единицы зависит в основном от соотношений между единицами исходного языка и языка перевода:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ